# Абагульненне па раздзеле «Беларусь і свет у XIX — пачатку XX ст.»

## Працуем з паняццямі

**1.** Выканайце заданні.

А. Размяркуйце прапанаваныя паняцці па чатырох сферах грамадскага жыцця: палітычная, сацыяльная, духоўная, эканамічная: *«амерыканскі» шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы, аўтаномія, Венская сістэма міжнародных адносін, водруб, выкупныя плацяжы, заходнерусізм, імперыялізм, індустрыялізацыя, канфесія, мадэрнізацыя, манапалістычны капіталізм, манаполія, міграцыя, нацыя, нацыяналізм, нацыянальная ідэя, нацыянальная самасвядомасць, нацыянальны рух, «прускі» шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы, сусветная вайна, урбанізацыя, хутар, часоваабавязаныя сяляне.*

Б. Канкрэтызуйце 3 паняцці з кожнай групы прыкладамі вывучаных гістарычных фактаў (падзей, з'яў, працэсаў) з гісторыі Беларусі.

**2.** Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, вызначце паходжанне назваў наступных кірункаў у мастацкай культуры: *рамантызм, рэалізм, сімвалізм, футурызм, натуралізм, авангардызм, мадэрн.* Як значэнні слоў, ад якіх паходзяць гэтыя тэрміны, суадносяцца са зместам мастацкіх твораў?

## Чытаем і пераўтвараем розныя віды тэкстаў

**3.** Выкарыстоўваючы картасхемы, складзіце кароткі аповед пра асноўныя падзеі Айчыннай вайны 1812 г. і Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі.

**4.** Знайдзіце агульнае і адметнае ў становішчы Беларусі ў перыяд Айчыннай вайны 1812 г. і Першай сусветнай вайны. Растлумачце свой адказ.




ВАРШАВА — Сталіцы
Пружаны — Іншыя населеныя пункты
Граніцы дзяржаў да 1812 г.
Граніца сучаснай Рэспублікі Беларусь
Найважнейшыя дарогі

ТЭРЫТОРЫІ
Расійскай імперыі
Вялікага герцагства Варшаўскага
Прускага каралеўства

наибольш актыўнага сялянскага супраціўлення
Месцы канцэнтрацыі войскаў

Размяшчэнне карпусоў Вялікай арміі напярэдадні і падчас наступлення
Размяшчэнне карпусоў расійскай арміі
Умацаваны лагер расійскіх войскаў каля Дрысы
Наступ войскаў Напалеона
Дзеянні карпусоў Вялікай арміі з польскімі фарміраваннямі
Адступленне расійскіх войскаў
Контрнаступ расійскіх войскаў
Разгортванне войскаў апалчэння
Месцы бітваў
Абарона Бабруйскай крэпасці 23.08–30.09

*Вайна 1812 г. на тэрыторыі Беларусі*




*Першая сусветная вайна на тэрыторыі Беларусі*

## Аналізуем, тлумачым і разважаем

**5.** Устанавіце прычыну і вынік у наступных парах гістарычных фактаў. Патлумачце свой адказ.

| | |
|---|---|
| Патрэба арміі Напалеона ў забеспячэнні правіянтам і фуражом | Стварэнне Часовага ўрада ВКЛ |
| Рэвалюцыйныя падзеі пачатку XX ст. у Расійскай імперыі | Станаўленне беларускага нацыянальна-культурнага руху |
| Развіццё беларусазнаўства | Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў |
| Прамысловая рэвалюцыя | Развіццё сістэмы адукацыі ў еўрапейскіх краінах |
| Дэкаданс | Навукова-тэхнічны прагрэс |
| Шматнацыянальны склад насельніцтва Беларусі | Міралюбнасць і талерантнасць як аснова менталітэту беларускага народа |
| Пачатак Першай сусветнай вайны | Крах імперый напачатку XX ст. |

**6.** Вывучыце дыяграму «Рух перасяленцаў з беларускіх губерняў на ўскраіны Расійскай імперыі ў 1909–1913 гг.».




**А.** З якімі падзеямі звязана актывізацыя перасяленчага руху з беларускіх губерняў на ўскраіны Расійскай імперыі ў 1909–1913 гг.? Якія катэгорыі насельніцтва ў ім удзельнічалі?

Б. Выкажыце здагадку, з якіх прычын людзі маглі вяртацца назад.

В. Усяго з беларускіх губерняў перасяліўся 24 951 чалавек. Вярнуліся назад 5406 перасяленцаў. Які працэнт перасяленцаў застаўся на новым месцы? Пра што сведчаць гэтыя звесткі?

Г. Прааналізуйце, з якіх губерняў было больш за ўсё перасяленцаў. Чым гэта магло быць абумоўлена?

## Абагульняем

**7.** Запоўніце табліцу, указаўшы гістарычныя з’явы, працэсы, што адбываліся ў Заходняй Еўропе і Беларусі ў XIX — пачатку XX ст. Зрабіце вывад.

| **Сферы грамадскага жыцця** | **Гістарычныя з’явы, працэсы, што адбываліся ў XIX — пачатку XX ст.** | |
|---|---|---|
| | **Заходняя Еўропа** | **Тэрыторыя Беларусі** |
| Эканамічная | | |
| Сацыяльная | | |
| Палітычная | | |
| Духоўная | | |

## Сістэматызуем веды

**8.** Выкарыстоўваючы стужку часу, прадстаўленую напачатку раздзела I, выканайце наступныя заданні:

1) Якімі падзеямі / з’явамі / працэсамі вы б дапоўнілі стужку часу? Чаму?

2) Прапануйце форму для іх абазначэння (карціна, картасхема, цытата, фотаздымак і інш.).

3) Прэзентуйце развіццё Беларусі ў XIX — пачатку XX ст. у выглядзе лагічнай схемы (ментальнай карты). Адлюструйце ў ёй эканамічнае, палітычнае, сацыяльнае і духоўнае развіццё.

**9.** Работа ў міні-групах.

Прывядзіце прыклады пераемнасці падзей і працэсаў XIX — пачатку XX ст. і сучаснага перыяду жыцця. Якія дасягненні гэтай эпохі мы выкарыстоўваем і сёння?